Паліна Грыб
palinagrib@gmail.com

# “Па балотах начамі ходзяць аблокі”



**Драма ў дзьвюх дзеях**

_Дзеючыя асобы:_

Ядзя

Маладая Ядзя

Валодзік
Айцец Аляксандр – святар

Пані Аня – сацыяльны работнік

Алег Уладзіслававіч – фізік, сябра

Вера – жонка Алега Уладзіслававіча

## Дзея першая

***На сцэне цёмна, гучыць як бы з мінулага голас Валодзіка, ён чытае:***

Па балотах начамі ходзяць аблокі. Спускаюцца з неба, толькі месяц выйдзе, ды сыходзяць між ялінамі да самай багны. Шчакочуць сабе жываты імшарніцай, пакідаюць расу на журавінах, ахінаюць сном неспакойных птушак і жаб. Даплываючы да чорнага балотнага возера, аблокі збіраюцца ў кола і круцяцца вакол вады, хаваючы ў сваім карагодзе таямнічы плывучы востраў. На востраве тым – вечна маладая, вечна зялёная і вечна маленькая бярозка, а пад ёй купінка – бы фатэль з моху. На гэтым фатэлі штоноч сядзяць душы памерлых, па якіх галосяць іх жывыя. І пакуль востраў плыве паўз возера, а аблокі хаваюць яго ў сваім абарончым маросным коле, сядзіць душа і выглядае – ці не прыйшоў да яго хто спаткацца. І плыве, плыве таямнічы востраў колькі гадзін, ад апошняга промня ўчора да першага промня заўтра, і як не прыходзіць да душы памерлай яе чалавек, так яна і сплывае з востравам у нябыт, чакаць наступнае ночы, калі чарга яе надыдзе. А як сплыве, аблокі распускаюць абдымкі, выдыхаюць раняшнюю пару і, аблегчаныя, падымаюцца высока на неба, сустракаць і злагоджваць сонца. І вострава тады - як не было. Толькі раса на журавінах ды чарнее тарфяным дном возера. І ў кожнага чалавека – свая такая ноч, раз у жыцці дадзеная, каб на спатканне з душой памерлага свайго прыйсці. Бо балота ўсё мёртвае захоўвае, а ўсё жывое забівае. Таму і ноч толькі адна, адна на ўсё жыццё.

### ***З’ява першая***

***На сцэне пачынае слаба свяціць ліхтар, на лаўцы ля плоту сядзяць Маладая Ядзя і Валодзік, абдымаюцца, дыялог адбываецца як бы працягам казкі:***

**Маладая Ядзя** *(пяшчотна, шэптам)*. Слухай, я цябе прасіла аб казцы, каб спакойна развітацца і спаць пайсці адразу, а ты мне якую расказаў? Як заснуць пасля яе?

**Валодзік.** А гэта па-праўдзе адзіная, якую я ведаю. Мне мама расказвала, як бацька памёр.

**Маладая Ядзя.** І ці хадзіў ты потым… на балота?

**Валодзік.** Як быў малы, то баяўся, а як падрос, то ў казкі верыць перастаў. Памёр чалавек – то і памёр, трэба памятаць аб тым, што паспеў зрабіць для людзей, а мой бацька шмат зрабіў, быў кавалём. Але ты ж ведаеш. Шкада, што рана сышоў, што не бачыў, як я школу скончыў, з табой вось не пазнаёміўся. Але што зробіш.

**Маладая Ядзя.** Так, а вось калі мы пойдзем да маіх бацькоў знаёміцца? Чаму мы не можам пайсці да іх і проста так ім усё расказаць? Яны добрыя людзі, будуць толькі радыя.

**Валодзік.** Смяешся! Чаго ж яны будуць радыя. Мала таго, што я адзіны сын у мамы, без бацькі выхаваны, жабрак амаль што, ды яшчэ і не такі адукаваны, вунь будаўнічы тэхнікум…

**Маладая Ядзя.** Ну і з таго, што ты кажаш, то ніводнай прычыны цябе не прыняць!

**Валодзік.** Ты на мяне праз каханне глядзіш, а бацькі твае па розуме будуць судзіць.

**Маладая Ядзя.** І што ты прапаноўваеш? Вось так сядзець штоноч і хавацца за вуглом? Больш за тое, нешта мне падказвае, што мама мая здагадваецца. Святло не гасіць у сенях. Яны цябе прымуць, як сына, павер мне.

**Валодзік.** Веру! Я проста хачу, каб ты была са мной шчаслівая, каб я быў роўня табе. Можа спачатку да канца давучыцца, ва ўніверсітэт пайсці?

**Маладая Ядзя.** Крыўдзіш, дурны, ты мяне крыўдзіш. Адвучыцца? Раз’ехацца на гады і кінуць мяне? У гэтым сэнс твайго адвучыцца? Не хочаш быць са мной, то так і скажы.

**Валодзік.** Я баюся.

**Маладая Ядзя.** Чаго?

**Валодзік**. Я баюся сапсаваць табе жыццё.

**Маладая Ядзя**. Бач, які ганарлівы, думаеш, ты справішся аж з тым, каб сапсаваць мне жыццё?

**Валодзік.** Слухай, усе гавораць пра тое, што табе трэба ехаць у горад, ва ўніверсітэт, і вучыцца далей. Ды я і сам ведаю, без размоваў. Ты ж пішаш як гэты, Пушкін! Ці хто там вядомая жанчына, каторая піша як Пушкін? Во ты такой і будзеш! На ўвесь саюз. А што са мной? А са мной нічога.

**Маладая Ядзя.** А без цябе нічога. Я ж не змагу пісаць, як ты з’едзеш, альбо я буду далёка. Словы павінныя быць адрасаваныя, павінныя чакаць чытача. А я апрача цябе чытачоў не хачу.

**Валодзік.** Ядвіга, ты павінна вучыцца і пісаць.

**Маладая Ядзя.** Толькі, калі ты будзеш побач. Ці ты проста ня ведаеш, як кінуць мяне, га?

**Валодзік.** Ну не. Хачу табе шчасця проста.

**Маладая Ядзя.** Дык будзь побач, падтрымай. І я тады стану пісьменніцай, тваёй жонкай, і маці нашага дзіцяткі. Аж тры ролі адразу, і ва ўсіх буду лепшай, як ты будзеш побач.

**Валодзік.** Я буду побач. Ты толькі абяцай пісаць.

**Маладая Ядзя.** Таржэственна клянусь да канца сваіх дней!

**Валодзік.** І што кніжку напішаш. І можа і разам з табой ва ўніверсітэт паступім і пераедзем у Мінск, га?

**Маладая Ядзя.** А можа! Толькі спачатку самае складанае – пазнаёміцца з маімі бацькамі.

**Валодзік**. Хвалююся ўсё адно. Не роўня я вам. Але я падрыхтуюся і на наступным тыдні прыду сватацца, дамовіліся?

**Маладая Ядзя**. Цэлы тыдзень яшчэ хваляваццa!

**Валодзік.** А потым цэлае жыццё цешыцца, як усё добра пройдзе. А што са мной будзеш толькі цешыцца, то я абяцаю.

**Маладая Ядзя.** Ой, ты мне ўжо казку на ноч спакойную абяцаў… Ладна, я амаль ужо і забылася, што там страшна было.

***Стук у дзьверы. Маладая Ядзя палохаецца, цалуе Валодзіка ў шчаку, збягае. Зацямненне.***

***З'ява другая***

***Стук працягваецца, святлее іншая частка сцэны, бачыцца пакой вясковай хаты. Беднай, але чыстай і светлай. Стол, стул, ложак, шмат кніжак у шафе. На фатэлі дрэмле Ядзя, годная жанчына год 70-ці, у хустачцы на галаве.***

**Айцец Аляксандр (з-за дзьвярэй)**. Пані Ядзвіга! Пахвалёны Езус Хрыстус. Гэта айцец Аляксандр!

***Ядзя ачомваецца, ўстае, падыходзіць, адчыняе дзьверы. Спакойная, лагодная, нібы стомленая.***

**Ядзя.** На векі вечныя, амэн! Вітам, ойча! Што мне сталася, што айцец духоўны да мяне зазірнуць вырашыў? Праходзьце, сядайце, во акурат маю кубэчак кіпеня, на каву чорную без цукру хопіць, альбо вы сёння нечым іншым хочаце дзень распачаць?

**Айцец Аляксандр.** Але ж і добра вы мяне ведаеце! Кубэчак чорнай і без цукру, калі ласка!

**Ядзя.** Як то не ведаць, вы, прабачце, з пятага класу мне чалавек вядомы. І почырк ваш пазнаю з тысячы, і з ходу назаву, дзе коску можаце прапусціць, а дзе паставіце лішнюю, а як лічыць, што ўсе з усімі ў гарадку знаёмыя, то яшчэ з калыскі вас памятаю. *(робіць каву, абодва адзін аднаму ўсміхаюцца)*

**Айцец Аляксандр.** Хацеў даўно вам падзякаваць за падтрымку. Я так спалоханы быў, як пасля семінарыі аказалася, што прыйдзецца ў сваёй парафіі служыць, што трэсліся ногі, як ішоў ад цягніка першы раз. Усе суседзі ў лаўках сядзяць, настаўнікі, нават тыя, што лаяліся, як дазнаваліся, што я ў касцёле быў. Памятаю, выходжу на першую Імшу, а перада мной фізік Алег Уладзіслававіч. Глядзіць, нібыта ўсміхаецца, а я яго як бы і не пазнаю, за вушы ён мяне цягаў без усмешкі, як даведаўся, што я таемна міністрантам служу. Дык вось… А вы ж ніколі і ніяк не паказалі, што да мяне як да вучня ставіцеся! І тады, у першую ж Імшу, руку мне пацалавалі. Як я тады ў сабе плакаў, аж трэслася падбароддзе… Дзякуй вам!

**Ядзя.** То мне прыемная ваша падзяка, але трохі і крыўдна! Ці то вы думалі, што не хопіць мне настаўніцкай мудрасці і выхавання прызнаць у былым вучні годнага дарослага чалавека? А яшчэ і святара! У якіх бы словах вы не рабілі памылкі ў школе, усё ж моц Хрыстовага святарства чалавека асвячае, а тым больш, Алесь, вас. Заўсёды я вас паважала,

і як памру, то Богу перадам, што тут у яго як мінімум адзін годны слуга ды ёсць. А на Алега Уладзіслававіча не сярдуйце, дарагі, ён жа фізік. Цяжка чалавеку такога дакладнага розуму глядзець высока і нешта бачыць там, дзе вокам анічога нябачна. Асабліва, як убівалі столькі год у галаву, што глупства ўсё. Прабачце яму, бо сам сабе прабачыць ня можа, хай хоць чужыя крыўды з плечаў чалавека сыдуць.

**Айцец Аляксандр.** Ды ўжо і прабачыў, і сто разоў ён прабачэння папрасіў. Во акурат на мінулым тыдні быў у яго. На жаль, справы няважныя, зусім слабы. Хіба гэтай вясной да Пана і адыдзе. Анкалогія.

**Ядзя.** Чула! Жах, што робіцца! Але мы ўжо і не маладыя з ім, ня кожнаму дадзена дажыць да сваёй анкалогіі… Ну але гэта ладна, вы што ж вырашылі з візіту да мяне свой дзень пачаць? А, ой, ойча, прабачце, я ж вам абяцала кніжку ў пазамінулую нядзелю.

*(Хоча ўстаць, пайсці за кніжкай. Айцец Аляксандр яе акуратна рукой прыпыняе, відаць клопат на яго твары).*

**Айцец Аляксандр.** Не турбуйцеся, я не па кніжку! Тыя дзьве яшчэ ляжаць, вясною працы шмат, не да чытання крыху.

**Ядзя.** А што ж тады, мо дапамога вам патрэбная, ойча? Як што, вы ж ведаеце, я ўжо жанчына не маладая, але чым змагу, то заўсёды гатовая дапамагчы.

**Айцец Аляксандр.** Я хацеў запытацца… Як вы сябе адчуваеце?

**Ядзя.** Чаго ж, дзякуй, адчуваю сябе добра! Відаць, без гароду ў гэтым годзе, але неяк пражыву. Не горай за чалавека свайго ўзросту пачуваюся.

**Айцец Аляксандр.** А настрой ваш як? Цяпер вясна, вятры моцныя апошнія некалькі тыдняў, людзі скардзяцца, што цяжка зусім… псіхалагічна.

**Ядзя.** Які настрой пасля сямідзесяці ў жанчыны, што жыве адна на хутары, айцец? Адзіны магчымы – чакаю.

**Айцец Аляксандр.** Чаго?

**Ядзя.** Паштарку з газетамі па панядзелках, аўталаўку па-аўторках і праз чацвер, Імшу ў нядзелю, на вялікія выходныя прыедзе дачка з унукамі, таго і чакаю!

**Айцец Аляксандр.** А вы маладзец, столькі газет выпісваеце! Хіба не больш за ўсіх астатніх разам узятых.

**Ядзя.** Ну дык і печка ў мяне ці ня большая за ўсіх у ваколіцы, жарэ што заўгодна! І літаратурны часопіс “Полымя” і газэту Віцебскага гарвыканкаму з дадазенымі леташніх намалотаў!

**Айцец Аляксандр.** А ці выпісваеце што медыцынскае, раптам?

**Ядзя.** Ойча, дзякуй вам за клопат, у мяне ўсё добра. Як заўсёды. Я ж адчуваю, нешта вас турбуе, нечага не дагаворваеце.

**Айцец Аляксандр.** Кажуць людзі, цяжка вам, можа варта і дапамогу якую зарганізаваць. Вы не падумайце, не таму, што вы старая, але ўсім часам патрэбная дапамога, асабліва ў дарослым веку…

**Ядзя.** Хто кажа?

**Айцец Аляксандр.** Вы проста скажыце, як што, я ж магу і грашыма, і людскім рэсурсам, талакой яно ж і прасцей…

**Ядзя.** Хто кажа, айцец? І што кажуць?

Я ніколі ў жыцці сваім не паскардзілася на жыццё, а яно ў мяне няпростае было, самі ведаеце, я сама дачку гадавала, вывучылася з ёй маленькай ва ўніверсітэце, працавала ў школе з раніцы да ночы. Але ні разу слёзаў маіх ніхто не бачыў, а я іх і не пралівала задарма. Бо кожны чалавек – камень, як трэба. І цяпер я меньшым каменем не стала, не турбуйцеся за мяне, калі ласка.

**Айцец Аляксандр.** Я не хацеў вас пакрыўдзіць, прабачце! Нядаўна проста моладзь нашая з лесу вярталася, казалі, з некім вы нібыта ў двары спрачаліся, казалі гучна, яны зазірнулі, ці не які злодзей залез, а вы адна… І да таго ж…

**Ядзя.** І што да таго ж?

**Айцец Аляксандр.** На гэтым тыдні была зноў малітва на могілках…

**Ядзя.** Здаецца, я ўжо казала, што не люблю пры ўсіх перажываць сваё гора, хоць яму і паўстагоддзя. А таму хаджу на могілкі сама, во надоечы…

**Айцец Аляксандр.** Спадарыня Ядзвіга… Помнік па мужы вашым заваліўся на бок. Ужо тры месяцы як, ажно нешта расці пачынае. Мы з жанчынамі пасля малітвы крыху абарвалі…

**Ядзя.** Дзякуй (*жорстка*).

**Айцец Аляксандр.** Крыху абарвалі траву, але ж яго так проста не паправіць, то я і падумаў, як вам патрэбная дапамога…У тым ліку матэрыяльная…

**Ядзя.** Мне сорамна, што вы вымушаеце перад вамі апраўдвацца, Алесь. Я не хаджу на могілкі так часта, сапраўды. Толькі я са сваім спачылым мужам і так размаўляю. Выходжу на вуліцу і размаўляю. Часам, сваруся, што не адказвае, што не паказваецца, што анідзе я не адчуваю, ці ёсць ён, ці няма, ані жывы ані мёртвы, ні ў ветры, ні ў зямлі пад каменем. Вы ведаеце, як ён загінуў?

**Айцец Аляксандр.** Прабачце мне, што балюча закрануў…

**Ядзя.** Я была цяжарная, хіба ці не апошнія тыдні насіла. І ён раптам выехаў некуды пад вечар, пакуль я ў бацькоў была, ды знік. Ані матацыклу, ані гуку ад яго самога. Дзень, два, тры. Адразу сябры шукаць пачалі, мяне з хаты не выпускалі нават, каб глупстваў не нарабіла. Цяжарная жынчына бывае страшная ў сваім адчаі. На чацвёрты дзень знайшлі абгарэлыя рэшткі матацыклу. Відаць, позна вяртаўся дадому, не заўважыў слуп. Але і пажарышча ніхто не заўважыў, тое на аб'яздной дарозе было. Вось толькі на чацвёрты дзень тыя…яго парэшткі з попелам і пылам з дарогі змялі, у скрыню склалі і пахавалі. А я хадзіла, дзіцятка насіла і толькі сабе дала абяцанне, што не заплачу, што дачку з яго вачыма нараджу без слязінкі, без гуку, каб толькі здаровая была, каб толькі ад яго не цела абвугленае засталося, а чалавек з ягонай крывёю і часткаю ягонага характару.

**Айцец Аляксандр.** Вечны адпачынак дай яму, Пане…

**Ядзя.** Хто б мне той вечны адпачынак даў… *(сумна ўсміхаецца)* Я як даведалася, пабегла на вуліцу, закрычала, каб завезлі мяне туды, да таго слупа, была страшная ў сваёй злосці. Я тады яшчэ маладая была, але настаўніцкі характар пальцам не задавіш, то і адвезлі, але

блізка не пусцілі. Толькі бачыла здалёк чорную пляму, але яго ўжо там не было, а потым у труне закрытай хавалі і таксама адмовіліся адкрыць, бо цяжарная! Вядаеце, як памірае чалавек, то здаецца, што душа яго – як шаль тонкі, як павуцінне, адыходзіць, адлятае, але яшчэ як бы і злавіць яе можна, схапіць тое, чым быў твой чалавек. Ад майго ж і цела не засталося амаль што, падабентсва хіба знявечанае. І душа… Куды я ні кідалася, у які бок не хацела бегчы – не было і следу. У ветры развеяўся, па зямлі попелам паслаўся? Мой жа чалавек, ён быў большы за тую скрыню, у якой яго хавалі…Вось так, ксёндз, я яго і да гэтага часу шукаю. Ля магілы ўжо даўно зразумела, што не магу – не знаходжу. Кажу яму: "Валодзік", а слова гэтае як аб камень халодны б'ецца і нават рэха яго не ловіць. Холадна мне і пуста на магіле, не магу, прабачце.

Спрабую размаўляць з партрэтам – ды таксама не магу, занадта яго мала таго здымка. Хіба гэта яго вочы, плоскія? Бягу на двор, на голас ужо з ім сваруся, з ім і з Богам, каб хоць неяк мне далі знак, што чуюць. А як аб сценку гарох, пуста і ціха, айцец. Увесь час яго шукаю, а не знаходжу анідзе, ні сярод жывых, ні сярод мёртвых.

Цікава, узгадвалі мы Алега… Уладзіслававіча. Яны з Валодзем маім сябравалі, хоць той і не вучоны быў. І вось якраз Алег і быў адным з тых, што яго знайшлі. Мы потым шмат так размаўлялі, я ўвесь час паўтарала: "Алег, як няма Бога, то куды знік наш Валодзік? Ці ты верыш, што ёсць сэнс у існаванні чалавека, калі вось так усё, што з ім звязанае, можа згарэць ушчэнт і распасціся на атамы. Ды ладна цела, а душа? А голас яго, а смех, а подых? Дзе яно ўсё, калі неба няма?" І во, бачыце, айцец, Алег Уладзіслававіч нешта ў гэтым адчуў. І па фізіцы сябра пахаваў, і па душы зразумеў, што адбылося. А я… Недзе там і я памерла, Алесь. Не яго ў той скрынцы пахавалі, мяне.

**Айцец Аляксандр.** Прабачце. Няма мне і сказаць вам чаго яшчэ… Дзякуй вам за гісторыю, спадарыня Ядзвіга. Вы вельмі моцная жанчына.

**Ядзя.** Усё жыццё я прысвяціла таму, каб мяне ніхто не захацеў пашкадаваць, айцец. І таму, каб дачка мая не адчувала сябе сіратой двух загінулых бацькоў. І вось цяпер, дзякую вам за клопат і за тое, што прыбралі траву з нашай – калі мы ўжо так тут гаворым – магілы, але я цалкам спраўная для таго, каб сама сябе яшчэ даглядаць.

**Айцец Аляксандр.** Я ніколі ў гэтым не сумняваўся, але вымушаны быў запытацца. Я вельмі люблю вас і паважаю. І, прабачце, усё ж прапаную кантрэктную опцыю: пані Ганна Лявошкіна цяпер на пенсіі, узяла сабе за служэнне догляд на старэйшымі парафіянамі. У сераду ў яе вольны дзень, яна магла б прыходзіць і крыху дапамагаць вам па гаспадарцы, хутка лета. Мухі, пыл, трава на ганку. Калі ласка, дайце выказаць вам маю павагу. Як ужо сакрэтамі дзяліцца, то я стаў святаром, дзякуючы нашым з вамі заняткам па літаратуры. Вы дапамаглі мне разглядзець вартасць душы.

**Ядзя.** Дзякуй за вашыя словы, дарагі Алесь. Яны мне вельмі важныя, але я ўжо хвалююся за тое, якой высакапарнай атрымліваецца нашая сустрэча. Серада, кажаце? У сераду я якраз цэлы дзень дома і нікога і нічога не чакаю, так што няхай Аня прыходзіць, каб вы ўжо не перажывалі, і, сказаць па праўдзе, адчапіліся, бо іначай, здаецца, вас не пераканаць у тым, што я ў парадку, няхай і старэйшая за палову бліжэйшых могілак.

**Айцец Аляксандр** (*устаючы*). Але ж і добра вы мяне ведаеце! Ну але і я вас, як бачыце, усё ж згадзіліся. Вам жа будзе прасцей ды весялей.

**Ядзя.** О, што весялей, то дакладна. З такой дапаможніцай не засумуеш. Страшна падумаць, але я ж спадарыню Ганну таксама вучыла, а яна ўжо на пенсіі, то гэта ж колькі

мне год! Але ўсё, не лічыце, калі ласка, бо я зусім засмучуся. Яшчэ шмат справаў на сёння, і ў вас… ну і ў мяне знойдзецца.

**Айцец Аляксандр.** Дзякуй вам яшчэ раз, што падзяліліся. Праўда, не ведаў дэталяў.

**Ядзя.** Як Алесю ніколі б вам не расказала гэтага, але як святару…

**Айцец Аляксандр.** Пахвалёны Езус Хрыстус!

**Ядзя.** На векі вечныя, амэн, ойча, плённай вам працы!

*Абдымаюцца, Айцец Аляксандр сыходзіць. Спадарыня Ядзвіга прыбірае са стала і садзіцца глядзець у вакно. Зацямненне.*

***З'ява трэцяя***

***На двары ля хаты ноч, але святлей, чым першы раз. Маладая Ядзя і Влаодзік нібы выходзяць з хаты.***

**Валодзік *(у хату).*** Дзякуй вам вялікі, яшчэ раз, ніколі такіх кіўбас смачных ня еў, гатовы вам яшчэ раз сказаць, да пабачэння!

**Маладая Ядзя.** А цяпер будзеш есці ўсё жыццё! Я, па праўдзе, менавіта такія яшчэ рабіць не спрабавала, але да снежня абяцаю навучыцца, як будзем жаніцца!

**Валодзік.** У снежні! Ажно ў снежні, аж ня верыцца! Ажэнімся.

**Маладая Ядзя.** А ты баяўся, я ж табе казала, што мае бацькі цалкам на маім баку, а таксама на баку ўсяго добрага і разумнага. А нашыя з табой адносіны якраз разумныя. Ты рукамі будзеш працаваць, я галавой, разам – як адзін нармальны чалавек. Ведаеш, як у легендзе, што чалавек чалавеку – палова, і важна сваю знайсці.

**Валодзік.** А не павінна палова пасаваць па ўзроўні? Ведаеш, усё твой бацька казаў пра Алега нешта…

**Маладая Ядзя.** А што пра Алега? Ну паступіў ва ўніверсітэт, будзе вялікім чалавекам, але ж мне вялікі навошта? Мне мой патрэбны. І бацькавы думкі наконт Алега я адразу яму абрэзала…

**Валодзік.** А былі ўсё ж у бацькі думкі, мне не падалося?

**Маладая Ядзя**. Ну былі. Але ці ён запытаўся ў мяне ці хаця б у Алега? Ты ж ведаеш, Алег закаханы ў Верку, а я ў цябе. І бацька мой тут не пры чым, мы жывем у новым свеце, дзе чалавек мае права абіраць сабе мужа і жонку сэрцам, а не бацькавым розумам.

**Валодзік.** Ваша праўда, Ядзвіга Міхайлаўна.

**Маладая Ядзя.** Ай, перастань, чаго ты!

**Валодзік.** Як хочаш, але на настаўніцу табе вывучыцца трэба, нельга такому характару прападаць дома.

***З'ява чацвёртая***

***Цёмна. Званок тэлефона. Чуецца, што чалавек устае з ложка і ідзе да тэлефона. Галасы Ядзі і Веры.***

**Ядзя.** Ало. Слухаю?

**Вера.** **памылкі ў гаворцы зробленыя наўмысна** Ядзя, прывет, гэта Вера, ты ўжо можа спіш?

**Ядзя.** Добры вечар, Верачка. Ну як там сплю, во ляжу з вачыма закрытымі, але да сна далёка. Нешта здарылася, што ў такі час?

**Вера.** Ой, прасці, што падняла з краваці. Ну во Алег… Слухай, слабы саўсем. Я ўжо ня знаю, чым яго тут лячыць, відаць, пара сціраць шторы, пыль выціраць, бо скора гасцей у дом прыдзёцца зваць на эта самае, ой, не хачу гаварыць.

**Ядзя.** Божа, ну што ж тут зробіш. Мучаецца моцна, баліць яму што?

**Вера.** Ой, дзякуй Божа, толькі спіт многа, даже чуць-чуць есць, но я ўжэ панімаю, што эта ему перед смертью чуць лучшэ становіцца, знаеш, гаварат, што некатарые лежачые дажэ так і ходят перад смерцю.

**Ядзя.** Верачка, каб я магла дапамагчы толькі, ты скажы, як што. Гора-гора… Але што ж ужо…

**Вера.** Ядзя, я не знаю, можа гэта не сэр'ёзна, но што-та ён цебя просіць пазваць. Ты прасці, можа там ему нічэво важнава не нада сказаць, толька гаварыт: "Пазаві мне Ядвігу Цярэшка, я с ней должэн пагаварыць". Я вот сцеснялась цебе гаварыць, зваць, а тут просіць, аж забіваецца. Гавару, ладна, пазаву, еслі дайдзёт да нас.

**Ядзя.** Дайду, чаго ж, дайду! Мы ж сябры са школы, я буду толькі радая сустрэцца. Можа і цябе адпусціць на якія некалькі гадзін, ты ж, думаю, пры ім і сядзіш увесь час?

**Вера.** Авой, сяжу, баюся, што як уйду, то ён памрэ без мяне. А я ж з ім пачці пядзесят лет, во трохі толька меньшэ, а разве ж эта важна, всё равно шчытаецца, цэлая жызнь пачці.

**Ядзя.** Верачка, я прыду, хочаш, цяпер? Ці раніцай?

**Вера.** Не, цяпер то ужэ позна, яшчэ там пад тваім хутарам можа якія ваўкі ходзят. Вот заўтра часов в 12 прыдзёт врач, а патом давай і ты, Ядзечка, еслі можэш, еслі не занята. І толька не гавары нічыво нікаму, прашу.

**Ядзя.** Куды ж я занятая, ага! Значыць, на палову першай буду ў вас. Трымайся, дарагая, дзякуй, што пазваніла!

**Вера.** Ой, дзякуй, што прыдзёш, можа трохі чалавек перад смерцю ўспакоіцца. Гавару, што ты там ужэ такова хочаш расказаць, дзед, а он усё "Ядвігу пазаві, Ядвігу". Ну то можэт доўг які.

**Ядзя.** Здаецца нічога ня вінны, але хто ведае, што чалавеку напрыканцы прыходзіць… Добра, Верачка, да заўтра, добрай ночы!

**Вера.** Ой, дарагая, добрай-добрай.

*Гудкі.*

***З'ява пятая***

***Дзень. Ядвіга ходзіць на хаце, сабраная, туды-сюды, але спакойна. У дзвьры грукаюцца.***

**Пані Аня.** Гэта я, Ядзвіга Міхайлаўна!

*Ядвіга адкрывае дзьверы.*

**Ядзя.** Анечка, я ж казала, можаш і не грукацца.

**Пані Аня.** Слухайце, ну яшчэ толькі другая наша серада разам, яшчэ трэба нейкія выконваць абязацельства прылічыя. Вы што, некуды збіраецёся?

**Ядзя.** Ну так. *(задумліва глядзіць на гадзіннік)*

**Пані Аня.** Авой, а куды? То можа я магу схадзіць, што купіць? Вам жа тут далёка, куды ж вы?

**Ядзя.** Да сяброў.

*Пані Аня пачынае бурную дзейнасць, крыху пераапранаецца, прыбірае, паралельна вядзе размову.*

**Пані Аня.** Да сяброў ды а 12-ай дня? Ну нешта дзіўнае, давайце я з вамі. Што вам у тых сяброў рабіць, га?

**Ядзя.** А я… *(аглядаецца)* А я во кніжку абяцала занесці. *(ідзе да шафы)*

**Пані Аня.** Вось я заўсёды вамі ў гэтым плане паражалася. **памылкі ў гаворцы зробленыя наўмысна** Столькі працы, столькі хазяйства, дзіцятка, Волечка, а вы яшчэ і чытаць паспявалі. Дык ладна чытаць, вы яшчэ і пісалі ж, кажэцца? Помню, мы з вамі сачыненія разам пісалі, як я не магла, не спраўлялася. Вы аж у шэсць раніцы мне во гэтыя дзьверы адкрывалі *(паказвае),* і дапамагалі. Я вам вельмі благадарная, ну вельмі. Сама хоць не вывучылася ні ў ва што, але во радая, што так усё склалася. Вы ж усё для нас, ну і для Волечкі.

**Ядзя.** Дзякуй, Анечка.

**Пані Аня.** Мы так у школе баяліся, калі ваш расказ у газеце надрукавалі, то думалі, што наша учыцельніца стане пісьменніцай, уедзе ад нас у Мінск ці Маскву, а вы во не ўехалі, а мы баяліся. І добры ж быў расказ, нешта пра дрэвы, помніцца?

**Ядзя.** Пра дрэвы, Анечка.

**Пані Аня.** Ну то дзякуй Богу, што вы нікуды не паехалі, што тут во засталіся ў хаце роднай. Можа яно і цяжка, і шкада жыцця таго, што магло б быць. Вой, гэта ж вы можа і замуж маглі б выйсці! Бо тут, я ведаю, вас хлапцы баяліся вашага ўзросту. Мой дзядзя як халасты быў, то пытаўся ў мяне, ці добрая ўчыцельніца. Кажу: “Ага, вучоная”. Але яму сказалі, што вы мужу свайму першаму верная, то ён і не пайшоў да вас, а ўжо быў нават кветкі купіў. Во сколькі ў нас усяго цікавага было ў моладасці, у маёй, у вашай можа яшчэ цікавей. А што цяпер у маладзёжы? І нічога і такога, хоць бы на якія танцы схадзілі, ну праўду ж кажу?

**Ядзя.** Адкуль жа мы пра іх ведаем, Анечка, мы ўжо на іншых планетах. А моладзь заўсёды дарослым папярок горла сваёй свабодай.

**Пані Аня.** Ай не скажыце, мы во нармальныя былі. Мы во якія былі цімураўцы проста, тут усяму гарадку дапамагалі, такія былі прыгоды. Во, а вы можа пра нас кніжку напішыце? Ужо прабачце, што падглядзела, але нешта ж вы пішаце. Расказ мо новы, у газету?

**Ядзя.** Ды нашто мне ўжо тыя газеты, Анечка. Сабе пішу.

**Пані Аня.** Ну а нашто сабе? Пісаць нада ў га-зе-ту, каб хто ўбачыў і прыехаў уручыць вам грамату і га-на-рар. А так навошта?

**Ядзя.** Бо ёсць такое, што і хочацца сказаць, а ня можаш. Ці то не чуе ніхто, ці то і ня можа пачуць, а не распавесці – не можаш.

**Пані Аня.** О, дык у вас цяпер я ёсць. Цяпер мне будзеце расказваць, можна нават і не запісваць! А вы раскажчыца – ой, ад Пана Бога. Памятаю, вы класе ў пятым нам расказалі гісторыю пра востраў, то я баюся да гэтага дня, так мне ўрэзалася.

**Ядзя.** Якую гісторыю, Анечка?

**Пані Аня.** Пра плывучы востраў на возеры, дзе там можна раз у жызні падысці да яго ноччу, і там будзе на ім твой пакойнік блізкі, то можна з ім пагаварыць раз на жыццё. Вось проста байка, здаецца, легенда, а так урэзалася ў памяць, я з балотаў вылятаю не пазней за дзьве гадзіны, каб нават намёку на пацямненне якое не было.

**Ядзя.** Але гэта ж добрая гісторыя, гэта пра апошні шанец, пра тое, каб сказаць несказанае, папрасіць прабачэння.

**Пані Аня.** А казаць адразу нада, пакуль чалавек жывы. А потым позна ўжо, хоць ты не нагаварыся. Толькі хіба калі які трагічны случай, можа там аварыя ілі што такой. Ой… Прабачце мне, Ядвіга Міхайлаўна, я нічога не мела на ўвазе канкрэтнага, ну проста разважаю і во нешта…

*Гадзіннік б'е 12. Ядзя падрываецца, выходзіць з хаты.*

**Пані Аня.** Вы ж толькі вярніцеся, пакуль я тут, бо дзьверы ж… О, ты глянь, паляцела птушачка. Нічога, яшчэ пажывем, Ядвіга Міхайлаўна, яшчэ ў нас усё добра будзе. Ага, толькі для памяці трэба нешта прынімаць, кніжку вунь забыла… Ну што зробіш, будзе повад прагуляцца яшчэ.

***З'ява шостая.***

***Цёмна. Гукі адкрыцця дзьвярэй.***

**Вера (шэпча).** Ядзенька, дарагая, як ты дашла?

**Ядзя.** Дзякуй, Вера, нармальна, трохі во па ямках, але зараз прысяду і добра будзе, я ў парадку. Як ён?

**Вера.** Спіць. Але ты вунь радам сядзь на табурэтку, то он паслушае скрып і праснёцца. Сёння цяжка, доктар сказал, ад пагоды.

***Цёмна. Гукі крокаў, зэдліку.***

**Алег.** Вера, ці ты званіла Ядзі?

**Ядзя.** Алег, дарагі, гэта я, ты як?

**Алег.** Я вінаваты, Ядзенька, які я вінаваты.

**Ядзя.** У чым? Ты што гаворыш? Такая хвароба можа прыйсці да кожнага.

**Алег.** Я па Валодзьку вінаваты, Ядзя, я цябе падмануў.

**Ядзя.** Ты што, Алег?..

**Алег.** Не разбіўся ён, мы яго згубілі проста, не маглі знайсці тры дні. А на чацвёрты малец Тамашоўскі сказаў, што матацыкл яго ў бок балота ехаў. Мы туды кінуліся, а там, Ядзя… Там і стаяў ягоны матацыкл, Ядзенька, ля сасны.

**Ядзя.** Якой сасны?

**Алег**. Там ля сцежкі шырокай, па якой па журавіны хадзілі. То ж журавіны якраз пачыналіся, але дажджы былі, казалі людзі, што небяспечна. А ён, відаць, пайшоў і ўсё, а мы ўжо не знашлі, Ядзенька. *(пачынае плакаць)*

**Ядзя.** Алег, не хвалюйся, дарагі, дзе не знайшлі?

**Алег.** На балоце. Ён, Ядзя, ён патануў у балоце, відаць. Праваліўся недзе, толькі матацыкл знашлі, Ядзя. А яго цела не знайшлі, шукалі, а там былі гэтыя вокны, відаць, ну ў якія можна было праваліцца.

**Ядзя.** Але як жа, а слуп, а аварыя?

**Алег.** Ядзенька, дарагая, мы забаяліся, што ты пойдзеш холадам яго шукаць, ты б пайшла б.

**Ядзя.** Я пайшла б.

**Алег.** Я прыдумаў, Ядзенька, я, што мы матацыкл разаб'ем і падпалім, і скажам, што згарэў, а ні ты, ні маці яго старая б не палезлі ў скрыню тую глядзець, во так і прыдумалі.

**Ядзя.** Алег. Што ты кажаш такое.

**Алег.** Я ўсё жыццё перад табой вінаваты, усё. Я табе ў школе сваю прэмію падкладваў часам, за матацыкл той, за няпраўду сваю. А як ты хадзіла і казала, што не адчуваеш яго ў магіле, я потым плакаў, Ядзенька, як я плакаў.

**Ядзя.** А я за гэтыя гады ані слязінкі.

**Алег.** Бо няма яго ў той скрынцы, рэшткі матацыкла, анучаў нейкіх накідалі, каб цяжэй было, камяні два.

**Ядзя.** То дзе ж ён тады?

**Алег.** Ды на балоце, відаць, Ядзечка. Недзе там і застаўся наш Валодзька. Я так даўно табе хацеў расказаць, але потым думаю, а раптам кінецца туды, а потым ужо ясна стала, што столькі год прайшло, куды кідацца, ды й забылася… А мне во не забылася, Ядзечка, я не мог памерці, цябе падманваючы.

**Ядзя.** Колькі год прайшло… І куды прайшлі. Кату пад хвост.

**Алег.** У цябе ж дачушка, у мяне во дзеткі, добра мы жылі, Ядзечка, хоць і цяжка табе было, але годна, а як быў бы Валодзік… Ды што ж, забрала багна.

**Ядзя.** Навошта ён пайшоў туды?

**Алег.** А хто ж цяпер яго запытае. Ну я во можа хутка памру, на днях, то запытаю, але як табе перадаць, то ня ведаю *(усміхаецца)*. Ён казаў надоечы, што збіраўся табе па журавіны паехаць, мяне з сабой клікаў, але я не змог тым вечарам. Думаю, то па ягады табе і дачушцы паехаў.

**Ядзя.** Жыві, Алег, жыві яшчэ, колькі зможаш.

**Алег.** А Валодзік, Ядзя?

**Ядзя.** А Валодзік…Жыві, дарагі, я на цябе не злуюся. Дзякуй, што расказаў. Жыві, дарагі.

**Алег.** Але ты ж усё жыццё паклала на горыч сваю, я ж ведаю, табе і кватэру ў Мінску давалі, і, кажуць, пісьменнік нейкі да цябе сватаўся вядомы, жыла б зараз на праспекце са столямі па чатыры метры, бяды б ня ведала. А на хутары тваім – гэта ж сэрца схопіць, ніхто і не даведаецца праз колькі гадзін.

**Ядзя.** Я пакрыўдзіла яго, а потым усё жыццё хацела папрасіць прабачэння, ды ня ведала, куды з ім – сваім “прабач” – дзецца. Ні да зямлі, ні да неба, не магла знайсці анідзе. Ні знайсці, ні адпусціць.

**Алег.** Ядзенька, ты мне адпусці мой грэх, калі ласка. Скажы мне, што магу памерці спакойна.

**Ядзя.** Можаш, але прашу цябе, патрымайся яшчэ. Дзякуй табе, Алег.

***З’ява сёмая.***

***На двары ля хаты, позні вечар. Ідзе да хаты цяжарная Маладая Ядзвіга, Валодзік нясе яе валізку, яна яго перапыняе.***

**Маладая Ядзя *(раздражнёна)*.** Не ўваходзь, пакінь тут рэчы, баюся, што бацькі спяць ужо. Я абяцала ім, што буду раней, заўтра ўсё ж прыедуць сваякі далёкія, то з раніцы маці на нагах будзе, а мне трэба ёй дапамагаць. Спадзяюся, не чакаюць ужо, а спяць…

**Валодзік.** Прабач, я не мог раней вызваліцца.

**Маладая Ядзя.** А я ўжо і не памятаю, як ты днём выглядаеш. Ноччу вяртаешся, раніцай, як сонца забярэцца, сыходзіш. Заўтра па мяне таксама прыедзеш апоўначы? Ці можа мне тут застацца на тыдзень які, усё роўна з сямейнага жыцця ў нас толькі спаць побач у ложку.

**Валодзік.** Ты ж ведаеш, такая праца цяпер, я аніяк не магу іначай.

**Маладая Ядзя.** Каб ты скончыў тэхнікум, то не было б у цябе такой працы, а як чалавек бы жыў з раскладам, выходнымі і адпачынкам.

**Валодзік.** Хіба ты не ведаеш, чаму я тэхнікум кінуў?

**Маладая Ядзя.** Ага, нібыта дзеля мяне і дзіцяці. Але гэта лухта. Мне ад тваіх цукерак, ад тваіх гасцінцаў, што ты недзе там знаходзіш, ані холадна, ані горача. Я цябе хачу побач, свайго мужа …і сябра.

**Валодзік.** Я ведаю добра, што такое жабрацкае жыццё. І калі есці няма чаго, і калі сціраюцца боты апошнія, а пра наступныя можна і ня марыць. Я вам такога жыцця не хачу.

**Маладая Ядзя.** А я не хачу жыцця, дзе я адна ўвесь дзень. Раней мы з табой шмат гаварылі, чыталі разам, хадзілі да сяброў хоць бы раз на якія пару тыдняў. А цяпер во як дзе збіраемся, то Вера з Алегам прыходзіць, ён заўсёды з ёй, а я – як удава ўсё адно.

**Валодзік.** Ты ведаеш, што пакуль я не магу іначай.

**Маладая Ядзя.** А я магу. І дай мне магчымасць жыць бяднейшай, але шчаслівейшай. Ужо мы з голаду не памром, ні ўдваіх, ні з дзіцём. У мяне бацькі ёсць, твая маці побач жыве. Ты ж анічога не бачыш, што ў свеце робіцца.

**Валодзік.** Бо не магу пакуль што.

**Маладая Ядзя.** То можа мне глядзець за цябе? Можа і жыць за цябе? Можа і бацькам і маці адначасова быць, пакуль ты забіваешся на працы.

**Валодзік.** Я ўсё ж унясу валізку ў хату ціхенька, яна цяжкая, табе нельга моцна напружвацца.

**Дзея другая.**

***З'ява першая.***

***На сцэне цёмна, звоніць тэлефон.***

**Айцец Аляксандр.** Ну што там, пані Аня?

**Пані Аня.** Няма. Не вярнулася!

**Айцец Аляксандр.** Дык вечарэе ўжо…

**Пані Аня.** Ага. Я б нават сказала і павечарэла і ўжо даже перавечарэла, цёмна робіцца зусім.

**Айцец Аляксандр.** Я праехаўся па акрузе з гадзіну назад, не было яе. Ці ёсць у вас нумар Вольгі, дачкі?

**Пані Аня.** Ёсць, але я вам так скажу, гэта рана. Навошта чалавеку на ноч нервы порціць? Ды і што мы скажам: "Здрастуйця, ваша мама тыдзень была як не ў сабе, а сёння раніцай некуды сабралася і пайшла?"

**Айцец Аляксандр.** Ну так і скажам. Хіба не праўда?

**Пані Аня.** Ну як бы і праўда, але ж мы і не даглядзелі. Ядвіга Міхайлаўна…

**Айцец Аляксандр.** Ці магло на яе так паўплываць, што мы пазаўчора пахавалі Алега Уладзіслававіча?

**Пані Аня.** Ды не, неяк яна нармальна, кажа, гэта ж жыццё. Правадзіла яго вачыма з пагорку, глядзелі мы на працэсію, потым з ёй памаліліся і як бы і ўсё.

**Айцец Аляксандр:** Добра, што-небудзь можа з сабой узяла?

**Пані Аня.** Смяяцца будзеце, ойча. Запісны сшытак свой, здаецца. Ляжаў заўсёды ці ў полцы тут во, ці на стале, а сёння няма. Думала, можа яна там што напісала, а ж гляджу – няма. А цікава яшчэ, што як бы шафка адна прыадчыненая была, я глянула – а там аніводнага сшытку няма. Думаецца, нейкі яна дзённік пісала ці мо раман. Мы ж усе думалі ў школе, што наша настаўніца пісьменніца і хутка куды-небудзь ды выедзе, але бачыце, аніякія ёй ня трэба былі сталіцы… А якія ж яна гісторыі расказвала, а казкі… Слухайце, можа зараз во на старасці год вырашыла паехаць у Мінск ці Маскву?

**Айцец Аляксандр.** Ага, у Парыж. Ладна, я хутка прыеду, будзем думаць.

**Пані Аня.** Давайце!

### *З’ява другая.*

*Сцэна зацягнутая дымам, здалёк чуецца голас Ядзі. Яна ходзіць на беразе балота і чытае казку, цяжка дыхае, трымае нешта ў руках.*

**Ядзя.** Па балотах начамі ходзяць аблокі. Спускаюцца з неба, сыходзяць да самай багны. Даплываючы да чорнага возера, збіраюцца ў кола і круцяцца вакол вады, хаваючы ў карагодзе плывучы востраў. На востраве тым –бярозка, а пад ёй купінка, на ёй сядзяць душы памерлых, па якіх галосяць. І пакуль востраў плыве, а аблокі хаваюць яго, сядзіць душа і выглядае – ці не прыйшоў да яго хто. І плыве колькі гадзін, і як не прыходзіць да душы памерлай яе чалавек, так яна і сплывае з востравам у нябыт, пакуль чарга яе надыдзе. А як сплыве, аблокі распускаюцца, і падымаюцца сустракаць сонца. І вострава тады - як не было. Толькі раса. І ў кожнага чалавека – свая ноч, каб на спатканне з душой памерлага прыйсці. Бо балота ўсё мёртвае захоўвае, а ўсё жывое забівае. І ноч толькі адна. Адна ноч, ты чуеш? ***(Ядзя разгублена сядае на мох).*** Валодзік! Божа мой, які Валодзік, чаго я чакаю. Валодзік! Хоць можа тут ты мяне пачуеш. Я столькі год цябе шукала, а цяпер во ведаю, што ты тут. Вядома, да цябе не дакрануцца, але ўжо не вецер і попел у скрыначцы, ты недзе тут мой чалавек, можа цяпер мяне пачуеш. Ага, пачуе… Божа! Ну хоць Ты! Якімі такімі шляхамі Ты мяне па жыцці вёў, каб я тут аказалася “ў цемры і цені смяротным”? Як смешна было памерці вось тут і вось так. Але хоць бы і побач былі, засталіся б у багне, як мушкі ў бурштыне.

*На заднім фоне плыве востраў, на якім пад бярозкай сядзіць Валодзік.*

**Валодзік.** А ўсё ж ты паверыла ў маю казку, га?

**Ядзя.** Валодзік!..

**Валодзік.** Не, любая, табе да мяне нельга! Стой там, толькі так. Уяўляеш, не бачыцца вечнасць, каб вось так, праз ваду. Але хоць так! Не варта да мяне, я халодны.

**Ядзя.** А я старая зусім, як ты пазнаў мяне?.. Я ўжо часам і сама сябе не пазнаю. Прабач мне, што я так выглядаю.

**Валодзік.** Усе жывое прыгожае, Ядзя! А ты дык асабліва, заўсёды. Я сумаваў па табе ў месцы, дзе немае часу, болей за вечнае, разумееш? І я не разумею! Анічога, уяўляеш. Такія складаныя думкі людзі часам спрабуюць асягнуць, а мы з табой во, сустрэліся ў дзіцячай легендзе, што мама мне чытала, каб па бацьку не плакаў. Ты ж па мне не плакала, Ядзя?

**Ядзя.** Я не верыла, што ты ў труне. Крычала табе, шаптала, праз Бога і Божую Маці перадаць хацела, а ні разу так і не здолела.

**Валодзік.** Мне не чуваць тут, каханая, толькі цішыня ды жабы.

**Ядзя.** Ці не… холадна табе?

**Валодзік.** А не… Не перажывай.

**Ядзя.** Я ўсё жыццё збірала словы, каб табе сказаць, паўстогоддзя ўсё чакала, што можа неяк думка мая да цябе прарвецца, а цяпер во быццам ня маю, што сказаць.

**Валодзік.** Ці стала ты пісьменніцай?

**Ядзя.** Не стала! Хіба толькі аднойчы расказ мой надрукавалі ў газеце, далі ганарар невялічкі. На яго купілі Волечцы ровар. Волечка! Наша дачка! У яе твой твар!

**Валодзік.** Волечка… Я не ведаю, але люблю Волечку!

**Ядзя.** Вы б сябравалі, Валодзік. У нас цудоўная дачушка. А ў яе ўжо свае дзеці. Ты дзядуля тройчы!

**Валодзік.** Дзядуля! Божухна, я ж і бацькам стаць не паспеў…

**Ядзя.** Ты плачаш?

**Валодзік.** Думаю, плачу. Душой плачу, бо целам я ж анічога аніяк. У багне не да слёзаў.

**Ядзя.** І я не плачу, усе гэтыя гады не плачу. Сталася каменем, каб выстаяць.

**Валодзік.** Ты ж мая моцная. А ці ты шчаслівая?

**Ядзя.** Ну цяпер то так, я ж цябе знайшла нарэшце. Зараз во так лягу – і можна з табой застацца. ***(кладзецца і праз ваду працягвае руку Валодзіку).***

**Валодзік.** Няможна. Тут самотна і ціха, халодна і сыра. Не для цябе тут.

**Ядзя.** Але не для мяне і там! Я ўсё жыццё паклала на тое, каб зразумець, што цябе няма болей. Уяўляеш, я ж у Мінск пераехала, вывучылася, а не змагла там жыць, вярнулася. Усё цягнула мяне, цягнула назад, а куды дакладна – не магла зразумець. І ты – ведаю, што памёр, а на магілкі не іду, не веру, што ты там. І што жывы – не веру. Ты прабач мне, Валодзік, твой помнік абваліўся зусім, мне сорамна.

**Валодзік.** Дык мяне ж там і няма, які там помнік. Пусты камень халодны, хай хоць рассыплецца.

**Ядзя.** Ты напраўду тут?..

**Валодзік.** Ага, як бачыш. Я тады за журавінамі паехаў табе, як во ўчора было, хоць і як бы вечнасць прайшла. Я нават назбіраў! ***(падымае з зямлі вядзерца, прасоўвае)*** Табе і… Волечцы!

***Ядзя цягнецца, але ён адумваецца і адрывае руку.***

**Валодзік.** Не, нельга! Не тваё гэта месца, не цягніся болей. Табе жыць яшчэ трэба. Тут халодна.

**Ядзя.** Я гэтыя гады і жыла за цябе толькі, не за сябе, і глядзела за цябе… А! Я ўсё ж напісала кніжку, уяві сабе! І не проста так напісала, а пісала як дзённік, кожны дзень, усё тое, што табе хацела распавесці і не магла, што ты павінен быў пражыць сам, на свае вочы бачыць, усё пісала. І ведаеш, дурная, я табе прынесла, вунь у мяшочку сшыткі! Ты толькі ўслухайся, прынесла сшыткі ***(павышае голас)*** НОЧЧУ! НА БАЛОТА! КАБ ЗАЧЫТАЦЬ ІХ СВАЙМУ ПАМЕРЛАМУ ПАЎСТОГОДДЗЯ НАЗАД МУЖУ!.. Заслужаная настаўніца беларускай мовы, Ядзвіга Міхайлаўна, ноччу на балота пайшла шукаць плывучы востраў, Валодзік, што са мной зрабілі гэтыя гады…

**Валодзік.** Анічагуткі! Ты такая ж, як была. Я ведаў, што мая Ядзя прыйдзе аднойчы. Я толькі гэтым жыў. Жыў, ты бачыш… Усё роўна хочацца да жыцця гэты стан параўноваць, але далёка не жыццё гэта, любая.

**Ядзя.** Я не магу так, мы столькі з табой не пражылі разам, мы столькі з табой павінны былі прайсці. А я… Я яшчэ і пакрыўдзіла цябе ў апошнюю сустрэчу. Каб ты ведаў, як я ненавіджу той дзень за тое, што ён быў. Як я сябе ненавідзела ўсе гэтыя гады, што апошнім, што

сказала табе, было “Можа мне і жыць за цябе?” Як быццам і я гэтую бяду на нас наклікала, на дзіцятка нашае. Як я магла цябе так пакрыўдзіць.

**Валодзік.** А я не пакрыўдзіўся тады, табе цалкам слушна балела. Шкада толькі, што ты потым столькі год правяла з гэтым болем… Але цяпер ты адпусці. Не дакарай сябе.

***Ядзя пачынае зноў да яго цягнуцца.***

**Ядзя.** Пусці мяне на востраў, калі ён вечны, то там абодва і застанемся. І я табе ўсё перакажу. І ты мне.

**Валодзік.** Нельга так, не пушчу. Не тая гэта вечнасць, якой ты заслугоўваеш.

**Ядзя.** А як жа рай, і чысцец, і пекла, Валодзік? Хіба ёсць яны? І дзе мы сустрэнемся, як я памру? І… ці буду я там старая?

**Валодзік.** Я ўсяго толькі свой цень. І можа толькі ў тваіх вачах, хто ведае.

**Ядзя.** То лепей не міргаць нават, каб ты ня знік?

**Валодзік.** І я ня буду, каб ты ня знікла.

**Ядзя.** Але хутка ўжо світанак.

**Валодзік.** Хутка, любая, хутка.

**Ядзя.** То не міргай, калі ласка. І я не буду.

**Валодзік.** І я не буду.

***Раптам чуецца голас пані Ані.***

**Пані Аня *(яшчэ далёка).*** Ядзвіга Міхайлаўна! Ядзвіга Міхайлаўна! Вы тут?

**Ядзя.** Валодзік, што ж такой, за мной прыйшлі! Мяне шукаюць.

**Валодзік.** Канешне, ты ж патрэбная людзям.

**Ядзя.** А мне яны – не. Я ўсе гэтыя гады шукала цябе, пісала табе, нават не спадзявалася, што пачуеш, а тут во бачу і нават магу дакрануцца… ***(спрабуе цягнуцца)***

**Пані Аня *(крыху бліжэй).*** Ядзвіга Міхайлаўна! Вы ведаеце, як я баюся балота, дзякуй Богу, хоць сонца ўстае!

**Ядзя.** Сонца ўстае, Валодзік, сонца, ты зараз знікнеш!

**Валодзік.** Як я шчаслівы што цябе шукаюць. Трымайся дзеля Волечкі, дзеля ўнукаў, не цягні да мяне рукі… Адсунься! Ніколі не слухалася нікога, дык паслухайся ўпершыню – адсунься. Не тваё гэта месца, не тут табе паміраць.

Ядзя. Туман рассейваецца…

Валодзік. І я разам з ім….

**Пані Аня *(крыху бліжэй).*** Ядзвіга Міхайлаўна!

**Ядзя *(перастае цягнуць рукі)*.** Ты толькі чакай мяне там, дзе б ты ня быў, Валодзік.

**Валодзік.** А ты толькі не спяшайся.

***На сцэне з’яўляецца Пані Аня, адначасова з тым, як знікае востраў. Пачынае світаць.***

**Пані Аня** ***(падбягае да Ядзі, абдымае яе, аглядае)***. Нічога сабе! Я ўжо і ня верыла, што змагу знайсці вас. Ну матка Боска! А я думаю, чаго мне гэта казка ў галаву ўлезла, пра балота, а вы вунь таксама з ёй носіцеся. Ці вы ў парадку?

**Ядзя *(суцішана)*.** У парадку, Анечка.

**Пані Аня** ***(абдымае, глядзіць на сшыткі)***. То хіба тут не тыпаграфія і не выдавецтва, Ядзвіга Міхайлаўна, да Мінска і Масквы далёка таксама.

**Ядзя *(суцішана)*.** Дзякуй, што прыйшла па мяне.

**Пані Аня**. Падзякуйце, што без міліцыі ды без дачкі вашай, хацелі во ўжо вызваньваць, ды я думаю – дай праверу адну ідэйку. Відаць, усё ж добра вас ведаю, га!

**Ядзя.** Прабач мне за клопат.

**Пані Аня.** Ці … яму… вы ўсё ж сказалі "прабач"?

**Ядзя.** Сказала, Анечка.

**Пані Аня.** Ну то добра, а цяпер во давайце ўставаць і выходзіць трохі, бо трэба яшчэ і ксяндзу сказаць. І "усё добра", і "прабач", і "добрай раніцы", хоць і не спаў, я думаю.

**Ядзя.** А раніца сапраўды нейкая асабліва добрая.

**Пані Аня.** Самы час, як тыя аблокі, пакінуць тэрыторыю халоднага і мокрага балота, Ядзвіга Міхайлаўна. ***(бярэ сшыткі, пад руку бярэ Ядзю і выходзяць разам са сцэны)***

**Канец.**